## НЕЗАБЫТЫ КУТОК

**Спецпраект газеты «Заря над Бугом» Брэсцкага раёна расказвае пра населеныя пункты, якія раней былі паспяховымі, але з часам сталі прыходзіць у заняпад. Чарговы раз карэспандэнт завітаў у Дубраву.**

Там налічваецца 46 жыхароў. З цікавінак — суседні рыбгас «Страдзеч», найстарэйшы ў нашай краіне (пабудаваны на пачатку мінулага стагоддзя). Яшчэ гадоў 15 таму ў вёсцы працавалі клуб, крама і бібліятэка. Зараз усё больш сціпла, а рыбгас — ужо не буйное прадпрыемства. Калісьці там былі ўласныя трактарны і аўтапарк, запраўка, кантора. Але, калі гаспадаром стала меднаўская птушкафабрыка, усё «пераехала» ў Медна. Начальнік рыбгаса Віктар Лазарук кажа, што жыццё наладзіцца, калі ў прадпрыемства з'явіцца добры ўласнік. З дзясятак гадоў таму тут атрымлівалі 120 тон рыбы, тры гады таму — 9, летась ужо 30, сёлета замахнуліся на 50.

Але існуюць і іншыя праблемы: «Гравійкай, што вядзе на Маларыту, з боку суседняга раёна чамусьці ўсю зіму чысціцца і пасыпаецца, а ў нас — ні тое ні другое, кажуць, грошай няма. У мяне, напрыклад, вялікая грузавая машына. Плачу немалыя грошы за тэхагляд і дзяржпошліну, якія павінны ісці, па ідэі, на рамонт дарогі. Але ў выніку даводзіцца плаціць яшчэ і за рамонт падвескі, што прыходзіць у непрыдатнасць. А калі ў вёсцы былі дзеці, кіроўца школьнага аўтобуса зімой апасаўся ехаць сюды з-за галалёдзіцы. Да таго ж у цёмны час сутак Рыбгасная зусім не асвятляецца — на ёй няма ні аднаго ліхтара. Яшчэ адной праблемай для мясцовых жыхароў з'яўляецца тое, што аўтакраму з-за адсутнасці ўсталяванага часу прыбыцця прыходзіцца чакаць, бывае, па некалькі гадзін».

## ЛЁГКІ ЎРАДЖАЙ

**Тут разбіраюцца не толькі ў вырошчванні агародніны і кветак, а і ў тым, як захаваць іх ад несумленных суайчыннікаў. Начальнік службы аховы прадпрыемства «Цяплічнае» Пётр КЛІМОВІЧ і кінолаг Леанід КАРПЕНКА расказалі карэспандэнту газеты «Маяк» Гомельскага раёна пра асаблівасці працы.**

— У бягучым годзе затрыманняў зладзюжак стала значна менш, — кажа кінолаг. — А яшчэ літаральна два гады таму з цяжкасцю адбіваліся ад раскрадальнікаў: мясцовых жыхароў, дачнікаў, бамжоў ды залётных расійскіх грамадзян. З кожным годам становішся больш вопытным, стараешся заняць назіральныя пазіцыі ў найбольш уразлівых месцах — там, дзе на прадукцыю палёў могуць панадзіцца аматары лёгкай нажывы.

— Так, сёлета мы затрымалі толькі пяць чалавек, — працягвае размову Пётр Клімовіч. — У асноўным крадуць бульбу, агароднінныя культуры. А раней зладзюжак было куды больш. Вось летась, напрыклад, аднаго і таго ж чалавека — жыхара Бярозак — лавілі тры разы.

## ЛЁН ЛЮБІЦЬ ПАКЛОН

**Так здаўна казалі на Беларусі. Лён — знакавая сельскагаспадарчая культура для Карэліччыны. Нездарма герб раёна ўпрыгожваюць яго сінія кветкі. Гэту культуру называюць не інакш, як паўночнае золата альбо паўночны шоўк. Таму і плошчы, якія адводзяцца пад пасеў лёну, значныя — 2130 га. Карэспандэнт газеты «Полымя» даведаўся больш падрабязна пра гэту вытворчасць.**

«Увогуле, вырошчванне паўночнага золата — вельмі працаёмісты працэс, — расказаў **намеснік дырэктара ААТ «Карэлічы–Лён» Фёдар ЖУК.** — Ад пасяўной і да ўборачнай выконваецца не менш за дзесяць відаў работ. І трэба адзначыць, што на кожнай ступені гэтага тэхналагічнага ланцужка неспрыяльныя ўмовы надвор'я могуць адбіцца на канчатковым выніку». Менавіта так адбылося сёлета. Па словах суразмоўніка, калі б не ліпеньская спякота і адсутнасць дажджоў, то аграрыі раёна маглі б пахваліцца рэкордным ураджаем ільну.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПАДТРЫМКА І АПОРА

## Што можа зрабіць на карысць выбаршчыкаў сельскі дэпутат

**Пашанцавала таму кіраўніку сельскага Савета, які можа назваць свой дэпутацкі корпус камандай. Нярэдка падчас папярэдняй, ды і ранейшых выбарных кампаній даводзілася чуць, што мясцовыя Саветы ў вёсках сябе паступова зжываюць. Склад іх нярэдка бывае фармальны, многія значацца толькі на паперы. Але ж апошнім часам даводзіцца сустракаць прыклады зусім іншага кшталту. Вось і старшыня Малькавіцкага сельскага Савета Ганцавіцкага раёна Таццяна ЛІТВІНОВІЧ гаворыць: «Дэпутаты — гэта мой актыў, падтрымка і апора».**

Таццяна ЛІТВІНОВІЧ і Вадзім АГАЛЕЦ.

### Прадаўцы сельмагаў

Варта сказаць, што сельсаветы на Ганцаўшчыне маюць сваю спецыфіку. У іх склад уваходзіць некалькі населеных пунктаў, а не дватры дзясяткі вёсак, як у Камянецкім альбо Пружанскім раёне. Але адлегласці паміж населенымі пунктамі тут бываюць даволі вялікія. І мясцовай уладзе важна мець свайго пастаяннага прадстаўніка ў той ці іншай вёсцы, які здольны аператыўна вырашаць асобныя пытанні нават па інфармаванні насельніцтва, які заўсёды на сувязі. У Малькавіцкі сельсавет уваходзяць тры вёскі. Акрамя Малькавічаў ёсць яшчэ Задуб'е і Ліпск.

Дэпутатам ад Ліпска стала Ганна САЙКО. Жанчына працуе прадаўцом у тутэйшай краме. З людзьмі камунікуе штодня, ведае ўсе іх праблемы, выступае сапраўдным вясковым лідарам. Яна, напрыклад, правяла вялікую падрыхтоўчую работу па падборы кандыдатуры старасты. Ды і арганізацыйную частку справы па правядзенні сходу таксама ўзяла на сябе. Такім чынам старастам у Ліпску абралі сапраўды аўтарытэтную і энергічную жанчыну Наталлю Лашко. А дэпутат ёй ва ўсім дапамагае. Як дэпутат Ганна Іванаўна не забывае адзінокіх, старых, нямоглых жыхароў вёскі. Наведвае іх, стараецца дапамагчы. А яшчэ яна добра ведае іх сваякоў і не саромеецца нават у магазіне пры ўсёй грамадзе напомніць маладым і здаровым пра сваяцкія абавязкі.

Ганна Сайко не адзіны работнік гандлю ў ліку малькавіцкіх дэпутатаў. Валянціна ЛАГВІНОВІЧ працуе ў магазіне аграгарадка Малькавічы. Валянціну Іванаўну ведаюць як змагара за прыгажосць і добраўпарадкаванне, а таксама за здаровы лад жыцця. Яна лічыць сваім абавязкам не толькі асуджаць п'янства як грамадскую загану: на любым сельскім сходзе ці іншым мерапрыемстве можа выказацца па гэтай тэме. Ды і канкрэтнай справай дэпутат дапамагае ўмацаванню цвярозасці ў вясковым асяродку. У яе не купяць піва непаўналетнім нават падстаўныя старэйшыя «сябры», бо ўвесь кантынгент пакупнікоў яна добра ведае. А дарасламу пакупніку, які ўжо не першы раз за дзень наведвае гандлёвы пункт, можа сказаць: «Сёння спіртное больш не адпускаецца. Вечар цвярозасці ў магазіне. Тым больш што сваю норму ты з самай раніцы ўжо выбраў з гакам». І спрацоўвае. У яе не просяць кнігу скаргаў, не ўчыняюць скандалы, не тэлефануюць на прамую лінію ў выканкам. Яе нават крыху пабойваюцца, асабліва тыя, за кім значацца піцейныя грашкі. «Валянціна Лагвіновіч рэальна працуе ў акрузе, — гаворыць старшыня сельскага Савета. — Яна мае вялікі вопыт грамадскай работы. Валянціна Іванаўна ў склад сельскага Савета ўваходзіць трэцяе скліканне. І з кожным разам яе дэпутацкі аўтарытэт у асяродку вяскоўцаў узрастае».

### І педагог, і пенсіянер

Дэпутат Алена ШАПЯЛЕВІЧ працуе выхавальніцай у дзіцячым садку. Як педагог яна асаблівае значэнне надае выхаванню моладзі. Жанчына не пройдзе міма, калі маладыя людзі, напрыклад, няправільна сябе паводзяць падчас адпачынку. Скажам, вечарам збіраюцца на аўтобусным прыпынку. І не проста сядзяць, спяваюць пад гітару, але п'юць піва, смецяць упакоўкамі ад розных прадуктаў, перашкаджаюць жыхарам суседніх дамоў спаць спакойна. І такія выпадкі былі, калі дэпутат неадкладна прымала меры, каб заклікаць да парадку занадта шумную кампанію. Ну а назаўтра была гутарка з бацькамі юнакоў і дзяўчат, не вельмі прыемная і лёгкая, але патрэбная... Паводле слоў старшыні сельвыканкама Таццяны Літвіновіч, істотна дапамагае мясцоваму органу ўлады, асабліва ў рабоце з адзінокімі састарэлымі грамадзянамі, дэпутат Яўген ШАПЯЛЕВІЧ, урач участковай бальніцы.

Начальнік вытворчага ўчастка сельгаспрадпрыемства Сяргей ДЗІЧКО лічыць сваім абавязкам дэпутата ўдзел у падтрыманні ў належным стане вясковых вуліц і захаванні парадку на тэрыторыі. Сельсавет жа не мае неабходнай тэхнікі альбо рабочых рук, калі справа датычыцца ўпарадкавання кар'ераў ды іншых падобных аб'ектаў. Дапамога сельгаспрадпрыемства тут бывае вельмі дарэчы. А вось, скажам, дэпутат Васіль МАЛЫШКА пасад ужо не займае, Васіль Рыгоравіч — пенсіянер, які падпрацоўвае малаказборшчыкам. Але ў Задуб'і ён выступае як сапраўдны прадстаўнік мясцовай улады. Праінфармаваць вяскоўцаў, правесці тлумачальную работу — часам гэта бывае найважнейшай справай на дадзеным этапе. І дэпутат гэтую работу паспяхова праводзіць у вёсцы, дзе пражывае дзве з паловай сотні чалавек. Акрамя таго, Васіль Малышка не пройдзе міма, калі бачыць нейкі непарадак. Аднойчы ён не пабаяўся, што называецца, выклікаць агонь на сябе, калі спатрэбілася прыцягнуць да адказнасці людзей, якія не выконвалі правілы ўтрымання сабак. Цяпер сітуацыя памянялася, гаспадары не выпускаюць сваіх гадаванцаў на «свабодныя» прагулкі. А іншыя вяскоўцы, чые малыя дзеці альбо ўнукі перасталі баяцца выходзіць на вуліцу, удзячныя Васілю Рыгоравічу.

### Прадпрымальнік

Яшчэ адзін дэпутат Вадзім АГАЛЕЦ таксама працуе ў сваёй акрузе на карысць выбаршчыкаў. Толькі ён — дэпутат раённага Савета па Малькавіцкай акрузе. Вадзім Сцяпанавіч — дырэктар прыватнага прадпрыемства «АверсЛес». Гэта прадпрымальнік, які стварыў прадпрыемства, даў работу землякам і працуе на карысць малой радзімы. Вадзім нарадзіўся і вырас у гэтай вёсцы, тут жывуць яго бацькі. Калі райвыканкам выставіў на продаж будынак былога камбіната бытавога абслугоўвання, Вадзім Агалец купіў яго на аўкцыёне, прывёў у парадак, узвёў прыбудову і стаў займацца піламатэрыяламі. На прадпрыемстве цяпер занятыя прыкладна два дзясяткі чалавек.

Вытворчы працэс пабудаваны так, што пасля распілоўкі драўніны застаецца шмат адходаў, якія могуць служыць палівам. Вядома, пры жаданні знайшліся б партнёры, якія купілі б матэрыял для кацельных, што працуюць на мясцовых відах паліва. Але дэпутат Агалец вырашыў дапамагчы адзінокім, маламаёмасным вяскоўцам. Сельвыканкам склаў спіс, у які ўвайшлі прыкладна 20 грамадзян, у іх ліку адзінокія, састарэлыя, інваліды. Машына прадпрыемства дастаўляе ім дровы проста на падворак. Усё гэта робіцца без аплаты, у якасці спонсарскай дапамогі.

— Вось ужо і ў гэтым годзе некалькі машын паліва адвезлі, — гаворыць Вадзім Сцяпанавіч. — Я ж сам не важу, адвозіць кіроўца. Дык некаторыя спецыяльна прыходзяць у пятніцу, каб падзякаваць. Усе ведаюць, што кожную пятніцу я бываю ў сельвыканкаме, можа прыйсці любы жыхар вёскі. І прыходзяць з самымі рознымі пытаннямі. Каму патрабуецца толькі слова падтрымкі, каму парада, ну а каму і дапамога ў вырашэнні пытання. Разам з мясцовай уладай стараемся дапамагчы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Галіны ПУПАЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 13 верасня 2018 года.**